ДАРОГАМІ ПЕРАМОГІ

# ЛЯ САМЫХ ВАРОЖЫХ ВАРОТ...

**9 красавіка 1945 года, на 1 388-ы дзень Вялікай Айчыннай вайны, Савінфармбюро паведаміла: «Войскі 3-га Беларускага фронта пасля ўпартых вулічных баёў завяршылі разгром Кёнігсбергскай групоўкі нямецкіх войскаў і штурмам авалодалі крэпасцю і галоўным горадам Усходняй Прусіі Кёнігсберг».**

Шлях да Кёнігсберга пачаўся яшчэ ў верасні 1944 г., Чырвоная Армія ў ходзе стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён» выйшла на подступы да Усходняй Прусіі, а 18 кастрычніка перайшла яе граніцы. Але восеньскае наступленне савецкае камандаванне вымушана было прыпыніць.

За Усходнюю Прусію гітлераўцы трымаліся літаральна зубамі. Ну як жа?! Менавіта гэтыя землі былі калыскай тэўтонскага духу, які некалі будзіў экспансію крыжакоў на ўсход. А Кёнігсберг – гістарычная сталіца Прусіі, дзяржавы, якая аб'яднала разрозненыя нямецкія княствы ў Германскую імперыю – лічыўся сэрцам трэцяга рэйха. Усходне-прускі плацдарм быў неабходны не толькі таму, што прыкрываў цэнтральную частку фашысцкай Германіі, але і для магчымага контрнаступлення – флангавага ўдару па часцям Чырвонай Арміі на варшаўска-берлінскім напрамку. Таму праціўнік арганізаваў у Прусіі моцную абарону на глыбіню 150-200 кіламетраў, добра прыстасаваўшы для гэтага і мясцовы ландшафт – азёры, балоты, рэкі, каналы і лясныя масівы. Акрамя таго, ледзь не ўсе больш-менш буйныя мясцовыя населеныя пункты ператварылі ў крэпасці – па-нямецку «фестунгі»: па сутнасці, гарады-самазабойцы, якія павінны былі змагацца і ў поўным акружэнні, спадзеючыся на забеспячэнне ўсім патрэбным па паветры.

Зразумела, што самым магутным фестунгам быў Кёнігсберг, нават подступы да якога ўяўляліся непераадольнымі: вакол горада была створана кальцавая абарончая сістэма з 12 вялікіх і 3 малых фортаў на адлегласці 2-4 кіламетраў адзін ад аднаго. Гарнізон форта складаўся з 200-300 абаронцаў і 30-40 гармат. Памяшканні фортаў мелі зводы таўшчынёй не менш метра, а над імі земляны насып да 3 метраў. Ды і сам Кёнігсберг быў моцным арэшкам. Вузкія вулкі, дзе не надта развернешся з якой тэхнікай, дамы з тоўстымі сценамі, якія ад падвалаў да гарышчаў сталі агнявымі кропкамі. Тут можна было абараняцца бясконца доўга!

Нашы войскі падрыхтаваліся да Усходне-Прускай аперацыі належным чынам.

**Савецкае камандаванне адпрацоўвала будучы штурм Кёнігсберга на яго рэльефным макеце ў 36 квадратных метраў!**

Для ўзяцця населеных пунктаў былі створаны спецыяльныя штурмавыя групы і атрады. Да таго ж у тыле нашых часцей пабудавалі палігоны, дзе салдаты днямі трэніраваліся знішчаць варожыя ўмацаванні, весці гарадскія баі і пераадольваць водныя перашкоды.

Усходне-Пруская стратэгічная наступальная аперацыя пачалася 13 студзеня 1945 г. 2-гі і 3-ці Беларускія франты атрымалі задачу адрэзаць прускую варожую групоўку (каля 800 тысяч салдат і афіцэраў) ад астатніх сіл вермахта, прыцiснуць да мора і адначасова нанесці магутны ўдар з усходу на Кёнігсберг, расчляніць і знішчыць нямецкія войскі.

Надвор'е стаяла нялётнае. Таму галоўную паласу абароны праціўніка нашы войскі прарвалі толькі праз тры дні, хаця на гэта адводзіліся суткі. З 15 студзеня надвор'е палепшылася, у баі актыўна ўключылася авіяцыя, і справа пайшла хутчэй. Ужо 19 студзеня Чырвоная Армія захапіла Цільзіт (зараз Савецк), 21 студзеня – Гумбінен (зараз Гусеў), 22 студзеня – Інстэнбург (зараз Чарняхоўск). 23-25 студзеня савецкія часці фарсіравалі рэкі Дэйма, Прэгель, Алле і 26 студзеня выйшлі да знешняга абарончага абвода Кёнігсберга.

Гітлераўцы ўпарта абараняліся, ярасна контратакавалі, прымушаючы там-сям чырвонаармейцаў губляць толькі-толькі адваяваныя ў ворага пазіцыі і нават часова пераходзіць да абароны. Усе нашы перамогі і ў студзені, і ў лютым, і ў сакавіку даваліся вялікай крывёю.



Васіль Савіч **БУБІЧ.**



Уладзімір Антонавіч **АРЦІМЕНЯ.**



Іван Мікалаевіч **СЯРЖАНІН.**



Павел Раманавіч **АЛЕЙНІКАЎ.**



Мікалай Аляксандравіч **СУХАН.**



Міхаіл Андрэевіч **ПРАКАПОВІЧ.**

Паступова набліжаўся дзень пачатку штурму самога Кёнігсберга – 6 красавіка 1945 г. Горад абараняла каля 130 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў. Прыкладна столькі ж было і атакуючых нашых байцоў. Недахоп жывой сілы мы кампенсавалі… надзвычай вялікай колькасцю буксіруемай і самаходнай артылерыі розных калібраў. А таксама авіяцыі. Снарадаў і бомб не шкадавалі. 9 красавіка ўсё было скончана: вечарам, у 21.30, камендант Кёнігсберга Ота Ляш падпісаў акт поўнай капітуляцыі гарнізона.

**Ва Усходне-Прускай стратэгічнай наступальнай аперацыі і ў штурме Кёнігсберга ўдзельнічала нямала нашых землякоў – ураджэнцаў Любанскага раёна.**

За праяўленыя мужнасць і адвагу многія з іх узнагароджаны медалямі і ордэнамі. Напрыклад, Сцяпан Ісайка з Ямінска – сяржант, камандзір разліку станковага кулямёта 82-га гв. стралковага палка 32-й гв. стралковай дывізіі ў баях на Зямландскім паўвостраве быў прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Чырвонага Сцяга, лейтэнант Венядзікт Бычок, камандзір агнявога ўзвода 1160-га гарматнага артпалка 162-й ГАБр атрымаў свой другі ордэн Чырвонай Зоркі і быў прадстаўлены да трэцяга, які знайшоў яго толькі праз 29 гадоў пасля вайны.

91 ураджэнец Любаншчыны ў баях на тэрыторыі Усходняй Прусіі быў адзначаны ордэнам Славы III ступені. Сярод іх – Мікалай Чэкан з Чачэнска, тэлефаніст 2-га дывізіёна 157-й армейскай гарматнай артбрыгады. Мікалай Апанасавіч у час баёў 7 красавіка 1945г. за кёнігсбергскі форт №10 пад шалёным абстрэлам гітлераўцаў ліквідаваў дзевяць парываў лініі сувязі паміж назіральным пунктам брыгады і пазіцыямі артылерыстаў. Гэта дазволіла знішчыць дзве фашысцкія артбатарэі, рэактыўную ўстаноўку, адправіць на той свет да роты немцаў. Пры ліквідацыі чарговага парыву лініі сувязі ён быў паранены ў руку, аднак справу давёў да канца. А Васіль Сушчэня з Калінаўкі – сяржант, наводчык станковага кулямёта 293-га гвардзейскага стралковага палка 96-й гвардзейскай стралковай дывізіі, быў узнагароджаны ордэнам Славы II-й ступені; свой першы ордэн Славы ён атрымаў у лістападзе 1944 г.

Можна бясконца пералічваць ураджэнцаў і жыхароў Любаншчыны, якія былі адзначаны ўзнагародамі за баі ва Усходняй Прусіі. Сярод узнагароджаных медалём «За адвагу» Фёдар Статкевіч са Старасека – радавы, трактарыст 4-й батарэі 144-й армейскай гарматнай артбрыгады – пры штурме Кёнігсберга ўзнагароджаны медалём «За адвагу», Васіль Паўлаў з Замошша – мінамётчык 3-й мінроты 95-га гв. стралковага палка 31-й гв. стралковай дывізіі; **Васіль Бубіч** з Вялікіх Гарадзяцічаў, радавы, нумар 3-й кулямётнай роты 171-га гв. стралковага палка 1-й гв. стралковай дывізіі ў адным з баёў на подступах да сталіцы Прусіі замяніў выбыўшага са строю наводчыка кулямёта і кулямётнымі чэргамі, адбіваючы варожую контратаку, застрэліў дванаццаць нямецкіх салдат і афіцэраў. Медалём «За адвагу» былі таксама адзначаны Павел Капко з Закальнага – кулямётчык 247-га гв. стралковага палка 84-й гв. стралковай дывізіі, любанчанін Мікалай Леановіч – радавы, радыст роты сувязі 163-га гв. стралковага палка 54-й гв. стралковай дывізіі, Васіль Філюта з Забалаці – радавы, зараджаючы батарэі 45-міліметровых гармат 168-га гв. стралковага палка 55-й гв. стралковай дывізіі, якога зноў жа адзначылі медалём «За адвагу» і многія іншыя. Усходне-Пруская стратэгічная наступальная аперацыя доўжылася 103 дні. За гэты час нашы войскі змаглі ўсё – і адрэзаць, і прыцiснуць, і ўдарыць, і расчляніць, і знішчыць. Апошнім горадам, якім 26 красавіка 1945 г. авалодала Чырвоная Армія, быў Пілау (зараз Балтыйск) – буйны порт і ваенна-марская база фашыстаў.

Пераможную кропку ў аперацыі ставілі ў тым ліку і нашы землякі. Напрыклад, **Уладзімір Арціменя** з Дубнікоў – малодшы сяржант, камандзір аддзялення 2-й роты 247-га гв. стралковага палка 84-й гв. стралковай дывізіі ў баі 25 красавіка на подступах да Пілау непрыкметна падабраўся да нямецкіх пазіцый, кідком гранаты знішчыў станковы кулямёт з яго разлікам. А любанчанін **Іван Сяржанін** – старшы лейтэнант, лётчык 3-й эскадрыллі 9-га знішчальнага авіяпалка 11-й штурмавой авіядывізіі ваенна-паветраных сіл Балтыйскага флота ў сакавіку 1945 г., суправаджаючы нашы штурмавікі, што грамілі караблі праціўніка ў Пілау, збіў у паветраных баях два варожыя самалёты «Fw-190» і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

На вялікі жаль, на тэрыторыі Усходняй Прусіі палягло шмат ураджэнцаў Любанскага раёна. Там склаў сваю галаву Герой Савецкага Саюза **Павел Алейнікаў** з Лапачова Брода, любанчане **Мікалай Сухан**, браты Павел і Іосіф Лагуны, Міхаіл Пісарчык з Обчына, Уладзімір Галай з Арлёва, Георгій Барысевіч з Плюсны, Міхаіл Гурыновіч з Урэчча, **Міхаіл Пракаповіч** з Новай Дубровы. А ўсяго іх больш за трыста. Іх імёны золатам выбіты на гранітных плітах шматлікіх мемарыялаў на тэрыторыі былой Усходняй Прусіі, зараз Калінінградскай вобласці РФ.

**А мы давайце заўсёды памятаць, якой непамернай цяжкай цаной далася нашым продкам Вялікая Перамога. Памятаць і быць ім за гэта ўдзячнымі.**

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**